А. М. Шугаеў

# Эстэтычнае выхаванне студэнтаў сродкамі беларускага фальклору

*(вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца»)*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*

«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

*А. М. Шугаеў*

# ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ СТУДЭНТАЎ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ
## *(вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца»)*

*Вучэбны дапаможнік з нотным дадаткам*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск,
БДПУ
2018

УДК 378.091.2(075.8)
ББК 74.58я73
Э87

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй педагагічных навук (пратакол № 9 ад 24.04.2018 г.)

Складальнік:
*А. М. Шугаеў*, дацэнт кафедры музычна-педагагічнай адукацыі БДПУ

Рэцэнзенты:
*Н. В. Чэрнікава*, кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры педагогікі БДПУ;
*Н. Г. Мазурына*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва БДПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Э87 **Эстэтычнае** выхаванне студэнтаў сродкамі беларускага фальклору (вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца») : вучэбны дапаможнік з нотным дадаткам / склад. А. М. Шугаеў. – Мінск : БДПУ, 2018. – 76 с.

ISBN 978-985-541-530-6.

У вучэбным дапаможніку адлюстраваны метадычны і практычны вопыт работы народнага ансамбля беларускай музыкі і песні «Ярыца», вядучага творчага калектыву Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Прадстаўлены нотны матэрыял твораў з рэпертуара ансамбля.

Адрасуецца кіраўнікам творчых калектываў, выкладчыкам і студэнтам, усім тым, хто цікавіцца фальклорнай спадчынай, беларускай народнай музыкай і пытаннямі эстэтычнага выхавання сродкамі фальклору.

**УДК 378.091.2(075.8)**
**ББК 74.58я73**

**ISBN 978-985-541-530-6**

© Шугаеў А. М., складанне, 2018
© Афармленне. БДПУ, 2018

# НАРОДНЫ АНСАМБЛЬ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ І ПЕСНІ «ЯРЫЦА»: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Народны ансамбль беларускай музыкі і песні «Ярыца» быў заснаваны ў 1990 годзе на кафедры народных інструментаў БДПУ. Ля вытокаў ансамбля стаялі мастацкія кіраўнікі: Раманцоў Віктар Рыгоравіч і Сінкевіч Ірына Васільеўна, Вадзім і Людміла Матанцавы. З верасня 2012 года мастацкім кіраўніком калектыву стаў лаўрэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, дацэнт Аляксандр Міхайлавіч Шугаеў, а Ларыса Мікалаеўна Красна працуе з ансамблем ў якасці хормайстра. У склад калектыву ўваходзяць энергічныя, актыўныя і ініцыятыўныя маладыя людзі, адданыя душой народнай музыцы, улюбёныя ў традыцыйную культуру. Многія творы з рэпертуару ансамбля апублікаваныя заслужаным дзеячам мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалаем Васільевічам Сіратой у рэпертуарных зборніках і карыстаюцца папулярнасцю ў аматараў народнай музыкі.





Выступленне ансамбля на Рэспубліканскім конкурсе "АРТ-вакацыі"

РЕПОЗИТОРИЙ

З моманту свайго заснавання ансамбль вядзе актыўнае творчае жыццё, неад'емнай часткай якога з'яўляюцца гастрольныя паездкі па Беларусі і за яе межамі. Народны ансамбль «Ярыца» прымае актыўны ўдзел у фестывалях і конкурсах рознага ўзроўню, з'яўляецца дыпламантам Рэспубліканскага конкурсу творчасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь «АРТ-вакацыі» (дыплом I ступені), Міжнароднага фестывалю народнай творчасці замежных студэнтаў у г. Брусы (Польшча), VI Міжнароднага фальклорнага фестывалю ў г. Рыміні (Італія, дыплом «Лепшы народны калектыў»). Пад кіраўніцтвам А. М. Шугаева народны ансамбль беларускай песні і музыкі «Ярыца» пастаянна прымае актыўны ўдзел у культурна-масавых мерапрыемствах, якія праходзяць на пляцоўках БДПУ, іншых устаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі. У 2015 годзе калектыў стаў лаўрэатам фестывалю «Залатыя ансамблі Сербіі» у г. Новы Сад.



VI Міжнародны фальклорны фестываль ў г. Рыміні (Італія, 2014)



Удзел у фестывалі "Залатыя ансамблі Сербіі" у г. Новы Сад (2015 г.)

Рэпертуар калектыву багаты і разнастайны. Яго аснову складаюць народныя песні розных рэгіёнаў Беларусі: каляндарна-абрадавыя («Ігралі-свяцілі», «Весела-ясна», «А ў кусце, кусце» і інш.), сямейна-абрадавыя («А ў полі тры крынічанькі», «А ў полі дуб зялёны», «Цячэ вада на быстрыню» і інш.), пазаабрадавыя («Зайчыкі», «А ў полі вярба», «А ў гародзе ярыца», «Ой, калі ж той вечар» і інш.), інструментальныя п'есы ў апрацоўцы М. Сіраты і іншыя творы. Артысты ансамбля знаёмяць прыхільнікаў з лепшымі ўзорамі і малавядомымі творамі беларускай музычнай спадчыны. Багаты рэпертуар, самабытнасць і прыгажосць касцюмаў, высокае выканальніцкае майстэрства прыносяць ансамблю заслужаны поспех на самых разнастайных пляцоўках.

Рэпазітарый БДПУ

Пад час рэпетыцый студэнты спасцігаюць асновы вакальнага, інструментальна-выканальніцкага і акцёрскага майстэрства, знаёмяцца з традыцыйнай культурай беларусаў праз народную музыку, далучаюцца да лепшых узораў традыцыйнай і сучаснай айчыннай культуры. Упарта і натхнёна працуюць над пастаноўкай голасу, над пашырэннем і ўмацаваннем дыяпазону, над акцэнтыроўкай і штрыхамі, над лагічным асэнсаваннем тэкстаў, што садзейнічае павышэнню якасці выканання музычных твораў. Акрамя шырока вядомых сучаснаму гледачу музычных інструментаў (баян, гармонік, скрыпка, цымбалы, кантрабас, бубен, барабан), студэнты іграюць і на традыцыйных беларускіх інструментах – каробачцы, жалейцы, разнастайных трашчотках, свісцёлках і іншых. Кіраўнік ансамбля падбірае музычныя творы, улічваючы ўзроставыя асаблівасці, музычныя прыхільнасці, тэмперамент і густ выканаўцаў, у працы над песнямі дабіваецца чысціні гуку, добрай дыкцыі і эмацыянальнага выканання.

Народны ансамбль «Ярыца» выхаваў за сваю гісторыю не адно пакаленне артыстаў-выканаўцаў народнай музыкі. Ансамбль для студэнтаў становіцца творчай сям'ёй, своеасаблівай краінай, дзе дзейнічаюць свае законы і традыцыі, з якімі яны знаёмяцца з першых крокаў у калектыве. «Ярыца» славіцца сваімі талентамі, і кожны ўдзельнік уносіць часціцу цяпла свайго сэрца ў агульную справу.





Дні беларускай культуры ў Латвіі (2015 г.)

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ